ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 4 (1017) | АЎТОРАК, 26 лютага 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## АБ ДАСЯГНЕННЯХ І ПРАБЛЕМАХ ВУЧОНЫХ

У пачатку лютага г.Гомель з кароткім візітам наведаў прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М.В.Мясніковіч. Ён сустрэўся з вучонымі, навуковымі супрацоўнікамі Інстытута механікі металапалімерных сістэм імя У.Белага НАН Беларусі, яго СКТБ "Металапалімер", дзе азнаёміўся з прыкладнымі распрацоўкамі, навейшымі вынікамі фундаментальных даследаванняў, выкананнем дзяржаўных навукова-тэхнічных, рэгіянальных праграм.

Адбылася зацікаўленая размова аб рэфармаванні навукі, фінансаванні фундаментальных даследаванняў, жыццядзейнасці канструктарска-тэхналагічных арганізацый, створаных акадэміяй для эфектыўнага ўкаранення навуковых распрацовак у народную гаспадарку рэспублікі, аб крытэрыях ацэнкі працы вучоных і інш.

У сустрэчы прынялі ўдзел старшыні аблвыканкама, абласнога Савета дэпутатаў А.С. Якабсон і В.С.Сяліцкі, старшыня Гомельскага гарвыканкама Л.В.Барабанаў, старшыня Савета рэктараў Гомельшчыны, член Савета Рэспублікі, рэктар нашага універсітэта М.В.Селькін.

Вырашана арганізацыйнае пытанне аб святкаванні навуковай грамадскасцю горада і рэспублікі 80-годдзя з дня нараджэння акадэміка У.А.Белага, які ўнёс значны ўклад у айчынную навуку, пэўны час узначальваў і нашу ВНУ.

## УДАСТОЕНА ПРЭЗІДЭНЦКАЙ СТЫПЕНДЫІ

За выдатныя вынікі ў прафесійнай дзейнасці прафесар кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства **Р.М.Казлова** ўдастоена стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая устаноўлена для дзеячаў навукі, адукацыі, культуры і аховы здароўя.

РЭХА ЗІМОВАЙ АЛІМПІЯДЫ

## СПАДЗЯВАННІ НА МЕДАЛЬ НЕ ЗДЗЕЙСНІЛІСЯ

У амерыканскім горадзе Солт-Лейк-Сіці завяршыліся чарговыя XIX па ліку і першыя ў трэцім тысячагоддзі Алімпійскія гульні па зімовых відах спорту. Упершыню на іх была прадстаўлена і Гомельшчына. Гонар Рэспублікі Беларусь на Белай Алімпіядзе абараняла адна з мацнейшых фрыстайлістак свету, майстар спорту міжнароднага класа, студэнтка завочнага факультэта спецыяльнасці "Фізічная культура" нашага універсітэта Ала Цупер. Трэнеры, спецыялісты і шматлікія балельшчыкі дый і сама спартсменка разлічвалі на адну з алімпійскіх узнагарод. І напачатку спаборніцтваў прагнозы пацвярджаліся. У кваліфікацыі Ала набрала трэцюю суму балаў. Пасляхова яна пачала і фінальныя скачкі. Пасля першай спробы займала другое месца. На жаль, у другім скачку Ала прыкметна зменшыла каафіцыент яго складанасці, да таго ж няўдалым аказалася прызямленне. У выніку спадзяванні на медаль не здзейсніліся. У агульным заліку наша спартсменка аказалася толькі дзевятай сярод дванаццаці фіналістак.

ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

## КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЯК АДКРЫЦЦЁ

Студэнцкія гады, па прызнанню ўсіх, хто іх зведаў – самыя лепшыя і памятныя. І перш за ўсё таму, што гэта час самасцвярджэння маладога чалавека як асобы, набыцця прафесійных ведаў, пошуку свайго месца ў жыцці. У Андрэя Еўтухова яны – на фінішнай прамой: да заканчэння вучобы на фізічным факультэце яму засталося крыху менш за паўгода. Калі зрабіць умоўны аналіз усяго, што было перажыта тут, у сценах ГДУ, станоўчых, радасных падзей і момантаў набярэцца нямала. Па-першае, яму не сорамна за "змест" сваёй залікоўкі, бо ў ёй з зайздросным пастаянствам дамінуе толькі адна адзнака – "выдатна". Таму заслужана ён неадназова ўдастойваўся імяннай стыпендыі – Францыска Скарыны. Па-другое, акрамя вучэбных поспехаў, ёсць у юнака і немалыя дасягненні ў навуковай творчасці. На рахунку А.Еўтухова – 15 (7 асабістых, астатнія – у сааўтарстве) апублікаваных у выданнях рознага ўзроўню навуковых дакладаў, артыкулаў, пачынаючы ад "Известий Гомельского государственного университета им. Ф.Скорины", зборнікаў матэрыялаў рэспубліканскіх навуковых канферэнцый студэнтаў і аспірантаў, і заканчваючы Гагарынскімі чытаннямі, што праводзіцца ў г.Маскве. А зусім нядаўна ён стаў адным з пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на лепшую навуковую работу, які праводзіцца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, удастоены Ганаровага дыплома і грашовай прэміі.

А пачыналася ўсё яшчэ на трэцім курсе, дзякуючы былому аспіранту кафедры радыёфізікі і электронікі Ю.В.Нікіцюку, які разгледзеў у юнака здольнасці да



даследчыцкай творчасці. Галіной яго навуковых інтарэсаў сталі лазерныя тэхналогіі, дакладней, узаемадзеянне лазернага выпраменьвання на паверхню рэчываў. Шмат работ як тэарэтычнага, так і практычнага напрамкаў выканана Андрэем па гэтай тэме. І амаль кожная з іх – своеасаблівае невялікае адкрыццё. Актыўны ўдзел студэнта ў навуковых канферэнцыях, конкурсах даваў яму новы імпульс у творчых пошуках. І адну з апошніх работ, прысвечаную лазерным метадам апрацоўкі металаў і сплаваў, што была даслана на названы вышэй конкурс, па заслугах і вартасці ацанілі ў рэспубліцы. Андрэй вельмі ўдзячны свайму навуковаму кіраўніку гэтага даследавання, дэкану фізічнага факультэта С.В.Шалупаеву. Сяргей Вікенцьевіч дэталёва і даходліва растлумачваў яму розныя тэхнічныя падрабязнасці, рэкамендаваў для знаёмства неабходную літаратуру па дадзенай тэматыцы, таму свой поспех Андрэй не аддзяляе ад заслуг і свайго кіраўніка.

Андрэй удзячны лёсу, што паступіў вучыцца менавіта сюды. Хаця ў СШ №7 г.Гомеля, якую закончыў з сярэбраным медалём, любіў не толькі фізіку, увайшоў у дзесятку мацнейшых на выніках абласной алімпіяды. Усё ж зрабіць канчатковы выбар яму дапамагла выкладчык фізікі ў іх школе Н.Д.Емяльянчанка, якая таксама атрымала дыплом аб вышэйшай адукацыі ў ГДУ.

"Новыя матэрыялы і тэхналогіі" – па такой спецыялізацыі набывае веды на вытворчым аддзяленні фізічнага факультэта Андрэй Еўтухоў. За імі, як ён мяркуе, вялікая будучыня. Ёсць і шырокае поле для далейшых навуковых даследаванняў у гэтай галіне фізікі. Юнак хацеў бы займацца імі і ў будучым, марыць паступіць у аспірантуру, каб потым кожны яго дзень быў як сапраўднае адкрыццё.

**Т.ДУБЯК.**
**На здымку: А.Еўтухоў.**
**Фота: У.Чысціка.**

## ДЛЯ ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ

Адбылася калегія ўпраўлення інфармацыі і друку аблвыканкама, на якой былі прааналізаваны вынікі работы за мінулы год, акрэслены задачы на бягучы, 2002-і. З дакладам выступіла начальнік упраўлення Т.Ф.Астракова, у абмеркаванні актуальных задач і праблем, звязаных з дзейнасцю сродкаў масавай інфармацыі, прынялі ўдзел і выступілі памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, галоўны інспектар па Гомельскай вобласці З.К.Ломаць, намеснік старшыні аблвыканкама Р.А.Ціханская, начальнік галоўнага ўпраўлення вытворча-тэхнічнага развіцця Міністэрства інфармацыі Н.Н.Брашко.

У ліку іншых разгледжаных на калегіі пытанняў была падрыхтоўка кадраў для рэдакцый газет Гомельшчыны. З падрабязнай інфармацыяй па ім выступіў дэкан філалагічнага факультэта дацэнт У.А.Бобрык.

## СТЫПЕНДЫЯТЫ ПРАФКАМА СТУДЭНТАЎ

**ГАЙКОВА Таццяна** – студэнтка 4 курса фізічнага факультэта.
**МІСАЧЭНКА Сяргей** – студэнт 5 курса юрыдычнага факультэта.
**КІСЕЛЬ Вольга** – студэнтка 5 курса факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.
**ЛОБАЧ Святлана** – студэнтка 4 курса геолага-геаграфічнага факультэта.

НА ТЭМУ ДНЯ

## ЯК РАЗМЯРКОЎВАЮЦЦА ЎЗНОСЫ СТУДЭНЦКАГА ПРАФСАЮЗА

Апошнім часам нямала размоў вядзецца аб такой грамадскай арганізацыі, як прафсаюзы. Усім ужо вядома пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за № 1804 ад 14 снежня 2001 г., згодна якой адменена безнаяўнае пералічэнне прафузносаў і цяпер праводзіцца іх збор наяўнымі грашыма па адпаведных ведамасцях. Студэнцкія прафсаюзы такое нававядзенне ўрада не закранула.

Для больш поўнай інфармаванасці членаў студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі ГДУ, на якія патрэбы выкарыстоўваюцца іх узносы, варта прывесці наступныя лічбы і факты.

Наша студэнцкая прафсаюзная арганізацыя налічвае ў сваіх радах звыш 5300 юнакоў і дзяўчат і ўваходзіць у Асацыяцыю прафсаюзных арганізацый студэнтаў і навучэнцаў краін СНД (Беларусь прадстаўлена ў ёй такам БДУ і Гродзенскім дзяржуніверсітэтам). На Гомельшчыне сярод прафарганізацый сістэмы адукацыі і навукі – яна буйнейшая. Кожны яе член плаціць 1% ад студэнцкай стыпендыі, тыя ж з іх, хто займаецца на кантрактнай аснове, – такі ж працэнт ад мінімальнай заработнай платы: 100 руб. Сума, як бачна, для плацельшчыка вельмі нязначная, але ў агульным аб'ёме ўнушальная і выкарыстоўваецца ў многіх напрамках студэнцкага жыцця. Так, прафкам студэнтаў ГДУ з'яўляецца спонсарам усіх культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў з удзелам студэнтаў універсітэта. Сярод іх – конкурсы "Ану, першакурснік!", "Містэр універсітэта", "Дні факультэтаў", "Дзень Святога Валянціна", правядзенне навагодніх вечароў, вечароў знаёмстваў, агеньчыкаў у інтэрнатах, спартакіяд па відах спорту і г.д. Іх пераможцам, актыўным удзельнікам уручаюцца прызы, куплюецца падарункі для дзяцей студэнцкіх сем'яў да навагодніх святаў.

Устаноўлены чатыры стыпендыі прафкама ГДУ ў памеры 10 тыс. руб. кожная для лепшых студэнтаў -актывістаў прафсаюзнай работы, выплаты якіх праводзяцца (дадаткова да вучэбнай стыпендыі) з прафсаюзных узносаў.

Акрамя гэтага чатыры разы на год на прафсаюзныя грошы закупляюцца білеты (50% іх кошту) для культпаходаў студэнтаў у абдрамтэатр (800) і маладзёжны тэатр (600).

Студэнты, якія трапілі ў цяжкае матэрыяльнае становішча па прычыне розных жыццёвых абставін, таксама могуць разлічваць на матэрыяльную падтрымку з гэтага ж грашовага фонду.

**Н.КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкама студэнтаў ГДУ.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры дыфураўненняў **МІРОНЕНКА Уладзімір Іванавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

***

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры эканамічных тэорый **КРЫВАШЭЕВА Ларыса Мікалаеўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

З абласнога семінара

# ПСІХАЛОГІЯ ДУХОЎНАГА ВЫМЯРЭННЯ

**Нягледзячы на тое, што ўсе мы імкнемся жыць добра і прыкладаем для гэтага максімум намаганняў, не заўсёды ўсё складваецца так добра, як хацелася б. Часам мы аказваемся ў сітуацыі адзіноты, неразумення, немагчымасці рэалізаваць сябе, страты сэнсу жыцця і г.д. Спосабам вырашэння гэтых і іншых экзістэнцыяльных праблем і прысвячаўся чарговы абласны псіхалагічны семінар "Псіхалогія духоўнага вымярэння", які арганізавала кафедра сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі ГДУ. У яго падрыхтоўцы ўдзельнічалі супрацоўнікі кафедры, псіхолагі, якія працуюць ва ўстановах адукацыі г.Гомеля, а таксама спецыялісты з Мінска і Харкава.**

Такія семінары праводзяцца штогод і маюць вялікае значэнне для яго ўдзельнікаў, таму што дазваляюць працуючым псіхолагам абмяняцца вопытам, а студэнтам – даведацца ад больш вопытных калег аб спецыфічных цяжкасцях у практычнай рабоце псіхолага і аб тым, якія зараз прыкласці намаганні для іх прадухілення.

Адкрыла семінар сваім выступленнем яго арганізатар загадчык кафедры дацэнт Г.В.Гатальская. Яна асвятліла асноўныя палажэнні экзістэнцыяльнага напрамку псіхалогіі, задачы і метады работы.

Праблемы свабоды, адзіноты, сэнсу жыцця хвалююць не толькі дарослых, але і ўмудроных вопытам людзей. Вельмі часта такімі пытаннямі цікавяцца і падлеткі, прычым для іх гэта не менш сур'ёзна. Пра гэта гаварыла ў сваім выступленні псіхолаг СШ №56, выпускніца ГДУ Галіна Бусурына. А для пачынаючых псіхолагаў (такіх у зале сядзела большасць) вельмі цікавымі былі яе парады і перасцярогі аб тых небяспечных момантах, якія могуць сустракацца ў практыцы маладога спецыяліста пры рабоце з такімі складанымі праблемамі, што закранаюць глыбінныя пласты псіхікі чалавека.

Выступленне Наталлі Шаньгіной, выкладчыка псіхалогіі ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў пры ГДУ, было прысвечана вырашэнню складаных момантаў, якія ўзнікаюць у рабоце псіхолага ў школе. Шчыра кажучы, аб тым, што могуць узнікаць падобныя цяжкасці, многія студэнты нават і не падазравалі. Да іх адносяцца няправільнае ўяўленне адміністрацыі і вучняў аб дзейнасці псіхолага, даручэнне яму спраў, якія не ўваходзяць у кола яго абавязкаў або перавышаюць яго кампетэнцыю, цяжкасці пры зносінах з бацькамі вучняў і г.д. Гаварыла яна і пра такую з'яву ў рабоце псіхолага, як "сіндром псіхалагічнага згарання" і пра тое, як яго пазбегнуць.

Але самым цікавым на гэтым семінары было выступленне псіхалагічнага тэатра "Ружа вятроў". Ён дзейнічае пры кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі пад кіраўніцтвам аспіранта Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (г.Мінск) Галіны Навуменка. Яна коратка расказала аб асаблівасцях яго работы і аб тых экзістэнцыяльных праблемах, якія могуць у ім вырашацца.

Наогул, адрозненне тэатра псіхалагічнага ад звычайнага заключаецца ў тым, што замест п'ес вядомых пісьменнікаў у ім разыгрываюцца сцэны з жыцця саміх удзельнікаў, г.зн. тыя складаныя моманты, якія цяжка паддаюцца вырашэнню. "Прагуляўшы" гэту сітуацыю, чалавек можа многае ўсвядоміць, убачыць па-новаму і такім чынам знайсці выйсце з яе. Да таго ж гэтаму садзейнічае дэталёвае абмеркаванне пасля кожнага "спектакля" дзеянняў яго ўдзельнікаў. У прынцыпе, такія "п'есы" не прызначаны для паказу на публіку, але ў дадзеным выпадку рабяты з задавальненнем зрабілі выключэнне. Тэма іх пастаноўкі "Чорны мэтр" датычылася практычна любога – і працуючага псіхолага, і чалавека, які да яго звяртаецца за дапамогай. Яны закранулі даволі хвалюючае пытанне нашых дзён: што адбываецца з чалавекам, які трапляе або да няведаючага "псіхолага", або да паўшамана, які "косіць" пад псіхолага, або да "чорнага мэтра" – псіхолага, які думае, што ведае аб людзях усё, а ў выніку рэальнага чалавека практычна не бачыць.

Трэба аддаць належнае акцёрскаму таленту ўдзельнікаў тэатра: уся зала была ў захапленні ад таго, наколькі ярка і запамінальна яны паказалі гэтыя вобразы (я лічу, што пачынаючыя псіхолагі надоўга запамятаюць, чаго варта засцерагацца ў сваёй рабоце). Для тых жа, у каго ўзнікне неабходнасць абмеркаваць свае праблемы з псіхолагам, яны выдзелілі некалькі прыкмет, па якіх можна лёгка адрозніць гора-"спецыяліста" ад сапраўднага псіхолага:

– ён часта ўжывае словы "правільна", "няправільна", "карма", "энергетыка", "нагавор" і г.д.;

– сцвярджае, што вы штосьці абавязаны;

– яму падыходзіць выраз "ёсць два меркаванні – маё і няправільнае;

– яго мова перанасычана навуковымі тэрмінамі;

– яму ў прынцыпе нецікавыя людзі.

Закончыўся семінар абмеркаваннем гледачамі ўсяго ўбачанага. Задаваліся пытанні, выказваліся меркаванні, абмяркоўваліся тэмы наступных семінараў і гучалі словы ўдзячнасці ў адрас Г.В.Гатальскай за арганізацыю такой выдатнай магчымасці сустрэцца, абмяняцца вопытам усім псіхолагам вобласці.

Усё ж псіхалогія – гэта такая сфера, дзе нават навуковыя семінары праходзяць заўсёды цёпла і цікава.

**Вольга ГРЫШЧАНОК,**
**студэнтка 5 курса**
**філалагічнага факультэта**
**і практычнай псіхалогіі.**

АБМЕРКАВАНА НА РЭКТАРАЦЕ

# НАС ЧАКАЮЦЬ ВАЖНЫЯ ЗМЯНЕННІ

На мінулым тыдні ў панядзелак адбылося пашыранае пасяджэнне рэктарата. На ім разгледжан шэраг пытанняў, якія датычацца далейшай жыццядзейнасці універсітэта. Шырокая праграма выступленняў выпала на долю прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С.Ф.Каморнікава. Як нам думаецца, найбольшую цікавасць выклікалі новыя правілы ўступных экзаменаў на 2002-2003 навучальны год. Сёлета яны будуць праходзіць у два патокі і маюць шэраг істотных адметнасцей. Аб іх, а таксама аб новым класіфікатары спецыяльнасцей, спецыялізацый і кваліфікацый, якія ўводзяцца з верасня 2002 года, мы паведамім у бліжэйшым нумары ў інтэрвью з С.Ф.Каморнікавым. На рэктарацы ён далажыў таксама аб развіцці бакалаўрыята і магістратуры. З новага навучальнага года магістратура пачне дзейнічаць на матэматычным, фізічным, філалагічным і эканамічным факультэтах. На астатніх факультэтах універсітэта прадугледжваецца развіццё бакалаўрыята.

С.Ф.Каморнікаў падвёў вынікі зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі, паведаміў аб цыклаграме навучальнага працэсу.

Рэктар універсітэта прафесар М.В.Селькін засяродзіў увагу ўдзельнікаў пасяджэння рэктарата на мерах, якія будуць прымацца па забароне курэння ў грамадскіх месцах. Да парушальнікаў прадугледжаны самыя строгія метады адміністрацыйнага ўздзеяння.

На пасяджэнні рэктарата заслухана выступленне старшыні прафкама Г.І.Варатніцкага аб зборы наяўных прафсаюзных узносаў, разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

# УРУЧАНЫ ЎЗНАГАРОДЫ ФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА

У папярэднім нумары нашай газеты паведамляліся прозвішчы студэнтаў ГДУ, якія сталі пераможцамі трэцяга тура II Рэспубліканскага конкурсу творчых работ студэнтаў па грамадскіх навуках "Беларусь у XXI стагоддзі" і іх навуковых кіраўнікоў. 20 лютага ў рэктарацы ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося ўшанаванне лаўрэатаў гэтага конкурсу. Іх горача павіншаваў з дасягнутай перамогай у рэспубліканскім саперніцтве студэнтаў рэктар універсітэта прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін. Міхаіл Васільевіч уручыў узнагароды і прэміі чацвёртакурснікам спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" **Сяргею Каморнікаву** і **Святлане Лін**, студэнту трэцяга курса **Яўгену Заваднюку**, пяцікурснікам **Вераніцы Брылёвай** і **Дзмітрыю Міхайлаву** – з юрыдычнага факультэта. Цёплыя словы ўдзячнасці выказаны ў адрас іх навуковых кіраўнікоў: прафесара кафедры эканамічных тэорый **М.В.Навучыцеля**, загадчыка гэтай кафедры **Б.У.Сарвірава**, дэкана юрыдычнага факультэта **Ю.А.Ключнікава**, загадчыка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права **Н.В.Капытковай**, асістэнта кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін **У.Г. Скуратава**.

Пры ўшанаванні лаўрэатаў конкурсу і іх навуковых кіраўнікоў выступіў таксама прарэктар па вучэбнай рабоце С.Ф.Каморнікаў.

ИНТЕРВЬЮ

# ЗАЧЕМ БГУшникам ОХРАНА?

***Как известно, чемпионом высшей лиги КВН в минувшем сезоне стала Команда Веселых и Находчивых Белорусского государственного университета. Среди студентов ГГУ есть немало ее страстных поклонников. И когда команда-победительница выступала в г.Гомеле, преодолев все препятствия и преграды, к ее участникам за кулисы буквально "прорвались" авторы этого интервью.***

Последний раз наши любимчики посещали Гомель в 2000 году и выступали во Дворце игровых видов спорта. На этот раз им "посчастливилось" выступать в цирке. На что капитан команды В.Шлеппо, выйдя на сцену, хотя более точно сказать, на арену, заметил, что "в прошлый раз нас перепутали со спортсменами, а в этот раз..."

Зал был забит до отказа. Но нашлось место и для охраны, которая должна была "оберегать" наших КВНщиков. Однако, последние очень скоро избавили зрителей от этого дискомфорта своей мини-сценкой "Самонаводящийся шлягер". Весь зал просто взорвался от смеха, когда Александр Трофимов признался в любви и попытался обнять убегающего от него стража порядка. Затем звучали как новые, так и старые шутки.

А после концерта мы, рискуя попасть в руки нашей доблестной милиции, задали ребятам вполне серьезные вопросы и получили на них не очень серьезные ответы.

**Корр.**: Какая публика лучше, российская или белорусская?

**Все в один голос!** Конечно, белорусская. Это 100%.

**Виталий Шлеппо (В.Ш.)**: Белорусская публика – самая лучшая публика в мире, потому что мы сами белорусы. Поэтому мы думаем так же, как и все люди, которые живут в Беларуси.

**Корр.**: Есть какие-либо причины, по которым вы бы не вышли на сцену?

**Виктор Толкач (В.Т.)**: Они должны быть довольно вескими.

**В.Ш.**: Ну, да... (задумываясь). У нас украли... нет! Стоп!.. украли костюмы – нет, всю одежду – все равно выйдем. Мы не выйдем только, если нас украдут.

**Корр.**: Что вдохновляет, а что может разочаровать?

**В.Т.**: Где? Вообще? (**Корр.**: Да.)

**Виталий Коломиец (В.К.)**: Как и любого человека: вдохновляют новые идеи, мысли, а разочаровать может их невыполнение, их нереализация.

**Корр.**: Чем вы занимаетесь помимо КВНа?

**В.Т.**: Ничем. Нет! Ну, у всех есть специальность. Я – эколог, а Виталий (Коломиец) – инженер-мелиоратор.

**Корр.**: Игра и жизнь – они как-нибудь переплетаются между собой?

**Все в один голос:** Всегда.

**Корр.**: Значит, на сцене вы такие же, как и в жизни?

**В.К.**: Конечно! А вы не видите?

**Корр.**: В жизни мы же вас не знаем.

**В.К.**: Мы сейчас в жизни.

**Корр.**: Ваша формула любви.

**В.Т.**: О! Это к Захарову.

**В.К.** (очень странно улыбаясь): Формула любви у нас очень простая...

**В.Т.** (смеясь): Пришла весна – пора любви.

**В.К.** (подхватывая): Ложись на кровать и не кричи.

**Корр.**: А если серьезно.

**В.К.** (делая серьезное лицо): Если серьезно – то никакой кровати...

Тут уже все поняли, что дальше интервью вряд ли будет серьезным. Да и ребятам пора было уходить.

После этой встречи можно с уверенностью сказать, что участники команды КВН БГУ полны энергии, хороши собой, обладают потрясающим чувством юмора, а в жизни ведут себя так же, как и на сцене. Пожелаем им удачи!

**Беседу вели:**
**Оксана ЛУГАНСКАЯ,**
**Елена КУРНОСЕНКО,**
**студентки гр. РБ-33 филологического факультета.**

**P.S.: шутка из разминки:**

**– Ребята, а зачем вам столько охранников?**

**– А это они вас от нас охраняют.**

старонкі гісторыі

# НАРОДНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

22 красавіка 1919 года пачаў сваю работу Гомельскі Губернскі Аддзел народнай адукацыі, які вырашаў усе пытанні народнай асветы.

У той час існавала адзіная школа, якая падзялялася на дзве ступені: школы першай ступені — пачатковыя школы і школы другой ступені — семігодкі і дзевяцігодкі. Наведванне школы першай і другой ступені было абавязковым для ўсіх дзяцей школьнага ўзросту.

У 1919 г. у г.Гомелі таксама працавала прыватная жаночая гімназія з правамі для навучэнцаў, якая налічвала восем класаў. На першае студзеня 1919 года ў ёй займаліся 402 навучэнцы.

У аднаўленчы перыяд было вырашана семігадовую школу лічыць асноўным тыпам агульнаадукацыйнай навучальнай установы, якая ахоплівала дзяцей ад васьмі да пятнаццаці год.

Аднак у 1921-1922 г.г. былі і праблемы ў галіне народнай адукацыі, звязаныя з вельмі нязначнымі матэрыяльнымі рэсурсамі, якія выдзяляліся на яе развіццё. У сувязі з гэтым колькасць школ скарацілася.

Гэтыя і наступныя гады характарызуюцца рознымі формамі дапамогі насельніцтва школе.

У 1922 г. Губернскі Аддзел народнай адукацыі пастанавіў: для ўпарадкавання школьнай справы неабходна наблізіць масавую школьную работу да рэальных умоў жыцця, аддаваць дзецям пэўную суму ведаў на аснове цвёрда распрацаванага плана. Так, у 1924-1925 г.г. пачаўся няўхільны рост дзяржаўных асігнаванняў на народную адукацыю, што прывяло да паляпшэння работы школ.

Больш увагі пачало ўдзяляцца развіццю школ па нацыянальнай прыкмеце. У перыяд 1925-1926 навучальнага года ў Гомельскай губерні налічвалася 92 беларускія школы, 26 — яўрэйскіх і 17 польскіх.

Пачынаючы з 1927 года, пасля далучэння Гомельскай губерні да БССР, у большасці пачатковых і часткі семігадовых школ навучанне было перадзена на беларускую мову. У некаторых школах выкладанне вялося на рускай мове, а беларуская з'яўлялася абавязковым прадметам навучання.

Была праведзена вялікая работа па вызначэнню новага зместу навучання і выхавання, падрыхтоўцы новых вучэбных праграм, выданню дапаможнікаў. Развіваліся інтарэсы і творчая актыўнасць навучэнцаў, умацоўвалася сувязь школы з жыццём, зацвярджаліся ідэі злучэння навучання з працай, паляпшалася пастаноўка разумовага і маральнага, працоўнага, эстэтычнага і фізічнага выхавання падрастаючага пакалення, укараняліся вучэбныя майстэрні, працоўныя пакоі, практыкавалася праца на вучэбна-доследных участках, назіранне за прыродай.

Гэты перыяд характарызуецца актыўным пошукам новых форм арганізацыі школьнага жыцця. Да канца 20-х гадоў былі дасягнуты прыкметныя вынікі ў выпрацоўцы рэжыму і ўнутранага распарадку школы, планаванні вучэбнага тыдня, года.

**М.КАЛЕСНІК,**
**вядучы архівіст дзяржархіву Гомельскай вобласці.**

# ПОЛОЖЕНИЕ

## ОБ ОБЩЕЖИТИИ УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ «ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ» ПО УЛ. СОВЕТСКОЙ, Д. 106 Г.ГОМЕЛЯ (ПОРЯДОК ВСЕЛЕНИЯ, ПРОЖИВАНИЯ, ВЫСЕЛЕНИЯ).

### I. ОБЩИЕ ПОЛОЖЕНИЯ

1. Настоящее Положение устанавливает порядок вселения в общежитие, проживания в нем и выселения из общежития профессорско-преподавательского состава и сотрудников университета.

2. Общежитие предназначается для проживания сотрудников и преподавателей в период работы в университете. Жилая площадь в общежитии предоставляется также работникам медицинских, культурно-просветительных учреждений, предприятий общественного питания, торговли, бытового обслуживания, а в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, и других предприятий, учреждений, организаций, непосредственно обслуживающих трудовой коллектив университета.

3. Общежитие предназначается для проживания одиноких граждан (жилые помещения находятся в совместном пользовании нескольких лиц, не состоящих в семейных отношениях), а также для проживания семей (жилые помещения, состоящие из одной или нескольких комнат, находятся в обособленном пользовании семей).

4. Жилые помещения в обособленное пользование в общежитии предоставляются одиноким гражданам, страдающим заболеваниями, при которых по заключению лечебно-профилактических учреждений, совместное проживание с ним в одном помещении невозможно, а в исключительных случаях – и другим одиноким гражданам.

### II. ПРЕДОСТАВЛЕНИЕ ЖИЛОЙ ПЛОЩАДИ В ОБЩЕЖИТИИ

5. Жилая площадь в общежитии предоставляется преподавателям, сотрудникам и другим гражданам по совместному решению администрации университета и профсоюзного комитета на время работы в университете в порядке очерёдности, исходя из времени принятия на учёт.

6. Общежитие предоставляется сотрудникам и преподавателям, не обеспеченным жилой площадью вообще: иногородним, проживающим на квартирах либо в частном секторе в качестве квартирантов; семьям, живущим на частных квартирах или проживающим в общежитиях других организаций и учреждений г.Гомеля и не имеющим своего жилья.

7. Общежитие предоставляется преподавателям и сотрудникам, приглашённым в качестве специалистов высокой квалификации (иногородним) по совместному решению администрации и профкома на время работы в университете (1 – 2 квартиры из общего фонда).

8. С учётом мнения трудового коллектива, в исключительных случаях, по совместному решению администрации и профкома общежитие предоставляется сотрудникам и преподавателям за многолетний безупречный труд и большие научные и педагогические достижения, имеющим жильё, но проживающим в крайне стеснённых условиях и состоящим на очереди нуждающихся в улучшении жилищных условий в исполкоме по месту жительства.

9. Предоставление жилых помещений в общежитии в совместное использование нескольким лицам, не состоящим в семейных отношениях, допускается при отсутствии медицинских противопоказаний к проживанию в таких помещениях.

10. Общежитие предоставляется в размере не менее шести квадратных метров жилой площади на одного человека.

11. Достоверность предоставляемых сведений на получение жилья в общежитии проверяется жилищно-бытовой комиссией Учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины».

12. На основании решения о предоставлении общежития администрация Учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» заключает с гражданином договор найма жилого помещения в общежитии на занятие предоставленной площади. Договор найма жилого помещения может быть заключён лишь на свободную жилую площадь.

13. Ректорат ведёт учёт договоров найма жилого помещения в общежитии, которые являются документами строгой отчётности.

14. Договор найма жилого помещения в общежитии может быть признан недействительным в судебном порядке в случаях:

– предоставления гражданами не соответствующих действительности сведений о нуждаемости в улучшении жилищных условий;

– нарушения прав других граждан или организаций на указанную в договоре найма жилую площадь;

– неправомерных действий должностных лиц при решении вопроса о предоставлении жилой площади;

– в иных случаях нарушения порядка и условий предоставления жилой площади.

Требование о признании договора найма жилого помещения в общежитии недействительным может быть заявлено в течение трёх лет со дня заключения договора.

15. Контроль за состоянием учёта граждан, желающих получить общежитие, и соблюдением порядка предоставления общежития осуществляется общественной комиссией по жилищным вопросам, созданной при исполнительных и распорядительных органах, а также с участием представителей профсоюзов и администрации Учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины».

### III. ПОЛЬЗОВАНИЕ ЖИЛОЙ ПЛОЩАДЬЮ В ОБЩЕЖИТИИ

16. Вселение преподавателей, сотрудников и других граждан в общежитие производится в установленном порядке комендантом общежития или заменяющим его работником на основании договора найма жилого помещения в общежитии.

17. Жилая площадь в общежитии не подлежит приватизации, обмену, разделу и сдаче в поднаём.

18. Граждане, проживающие в изолированных жилых помещениях, вправе вселять в занимаемые помещения своих несовершеннолетних детей и супруга (супругу).

Вселение других членов семьи в указанные помещения допускается лишь с разрешения администрации Учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» и профсоюзного комитета при письменном согласии совершеннолетних членов семьи гражданина, проживающего совместно с ним.

**19. Проживающие в общежитии преподаватели, сотрудники и другие граждане обязаны:**

– соблюдать правила внутреннего распорядка общежития и правила пожарной безопасности;

– использовать предоставленную жилую площадь в соответствии с её назначением;

– бережно относиться к жилым помещениям, местам общего пользования, оборудованию и инвентарю общежития;

– соблюдать чистоту в жилых помещениях и в местах общего пользования;

– экономно расходовать воду, газ, электрическую и тепловую энергию;

– своевременно вносить плату за пользование жилой площадью в общежитии и за коммунальные услуги.

**20. Проживающим в общежитии запрещается:**

– производить самовольно переоборудование и перепланировку помещений;

– самовольно переселяться из одного помещения в другое. Переселение граждан из одного жилого помещения в другое в общежитии производится на основании решения администрации Учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» по согласованию с профсоюзным комитетом с заключением нового договора найма жилого помещения.

21. Эксплуатация жилых помещений в общежитии, их содержание и ремонт осуществляется в соответствии с заключенными договорами о найме жилых помещений.

### IV. ПЛАТА ЗА ПОЛЬЗОВАНИЕ ЖИЛОЙ ПЛОЩАДЬЮ И ЗА КОММУНАЛЬНЫЕ УСЛУГИ

22. Граждане, проживающие в общежитии, вносят плату за пользование жилым помещением и за коммунальные услуги в соответствии с заключенным с администрацией Учреждения образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» договором найма жилого помещения.

23. Тарифы за пользование жилым помещением и за коммунальные услуги являются обязательными для применения организациями, предприятиями и учреждениями, в собственности которых находятся общежития, и для граждан, проживающих в них.

24. Граждане, проживающие в жилых помещениях, находящихся в совместном пользовании нескольких лиц, не состоящих в семейных отношениях, производят плату за пользование жилым помещением и за коммунальные услуги по ставкам квартирной платы и тарифам, установленным для общежитий.

25. Граждане, проживающие в жилых помещениях, находящихся в обособленном пользовании, вносят плату за пользование жилым помещением и за коммунальные услуги (холодное и горячее водоснабжение, канализация, отопление, вывоз и обезвреживание твердых бытовых отходов, пользование лифтами, газоснабжение, электроэнергия) по ставкам квартирной платы и тарифам, установленным законодательством для домов государственного жилого фонда.

26. Плата за пользование общежитием и за коммунальные услуги вносится за каждый истёкший месяц не позднее пятнадцатого числа следующего месяца.

В случае несвоевременного внесения платы за пользование общежитием и за коммунальные услуги взимается пеня в размере 0,5 процента суммы этих платежей за каждый день просрочки.

### V. ВЫСЕЛЕНИЕ ИЗ ОЩЕЖИТИЯ

27. Выселение из общежития допускается лишь на основаниях, установленных Жилищным кодексом Республики Беларусь.

28. Выселение из общежития производится в судебном порядке. Допускается выселение в административном порядке с санкции прокурора лишь лиц, проживающих в общежитиях, грозящих обвалом.

29. Прекратившие работу сезонные, временные работники и граждане, работавшие по срочному трудовому договору, а также граждане, обучавшиеся в учебных заведениях и выбывшие из них, подлежат выселению без предоставления другого жилого помещения из общежития, которое было им предоставлено в связи с работой (учебой).

Другие работники организаций, поселившиеся в общежитии в связи с работой, могут быть выселены без предоставления другого жилого помещения в случае увольнения по собственному желанию без уважительных причин, увольнения за нарушение трудовой дисциплины или совершение преступления, а также в случае обеспечения этих лиц другим жилым помещением в данном населенном пункте.

30. С предоставлением другого жилого помещения могут быть выселены лица, прекратившие работу по иным основаниям, чем указаны в пункте 29 настоящего Положения, а также:

30.1. инвалиды войны и другие инвалиды из числа военнослужащих, ставшие инвалидами вследствие ранения, контузии или увечья, полученных при защите бывшего СССР или при исполнении иных обязанностей военной службы, либо вследствие заболевания, связанного с пребыванием на фронте;

30.2. участники Великой Отечественной войны, пребывавшие в составе действующей армии;

30.3. семьи военнослужащих и партизан, погибших или пропавших без вести при защите бывшего СССР, Республики Беларусь или при исполнении иных обязанностей военной службы;

30.4. члены семьи умершего работника, а также погибшего военнослужащего, которому была предоставлена жилая площадь в общежитии;

30.5. инвалиды 1-й и 2-й групп;

30.6. воины-интернационалисты, принимавшие участие в боевых действиях;

30.7. одинокие лица с проживающими с ними несовершеннолетними детьми;

30.8. граждане:

30.8.1. ставшие инвалидами вследствие ранения, контузии, увечья, профессионального заболевания, полученных при исполнении производственных или служебных обязанностей;

30.8.2. проработавшие в организации, предоставившей им общежитие, не менее 10 лет;

30.8.3. уволенные в связи с ликвидацией организации либо по сокращению численности или штата работников;

30.8.4. имеющие право на трудовую пенсию по возрасту (в том числе на льготных условиях), а также за выслугу лет;

30.8.5. заболевшие и перенесшие лучевую болезнь, вызванную результатами катастрофы на Чернобыльской АЭС, а также инвалиды, в отношении которых установлена причинная связь наступившей инвалидности с катастрофой на Чернобыльской АЭС;

30.8.6. члены семьи которых проживают с ними в одном жилом помещении, работают в организации, предоставившей жилую площадь в общежитии или выполняют работу, связанную с непосредственным обслуживанием трудового коллектива этой организации.

31. В случае сноса дома, в котором расположено общежитие, или переоборудования этого дома (жилого помещения) в нежилой, а также, если дом (жилое помещение) грозит обвалом, проживающим в нем гражданам предоставляется другая жилая площадь в общежитии. При невозможности предоставления жилой площади в общежитии указанным гражданам, за исключением сезонных, временных работников и граждан, работающих по срочному трудовому договору, а также граждан, поселившихся в связи с обучением, предоставляется другое жилое помещение.

32. Предоставляемое гражданам в связи с выселением из общежития другое жилое помещение должно отвечать установленным санитарным и техническим требованиям и находиться в черте данного населенного пункта.

33. Граждане, самоуправно занявшие общежитие, выселяются без предоставления им другого жилого помещения. Граждане могут быть выселены из общежития без предоставления другого жилого помещения также на основаниях, предусмотренных статьей 39 Жилищного кодекса Республики Беларусь.

В случае признания договора найма жилого помещения в общежитии недействительным указанные в договоре лица подлежат выселению в соответствии со статьей 72 Жилищного кодекса Республики Беларусь.

**УТВЕРЖДЕНО РЕКТОРОМ ПО СОГЛАСОВАНИЮ С ПРОФКОМОМ.**

**времена года**

# Масленица



Славяне готовились к приходу Весны, зазывали ее, подготавливали ее появление, и даже специальный праздник придумали, который в пору становления христианства на Руси получил название "Масленица". В этом естественном празднике наших предков-славян отражена цикличность природы: люди не просто устраивали карнавал, чтобы повеселиться, а праздновали переломный момент в развитии естественного процесса, от которого зависела их жизнь.

Ранней весной в веселом ритуальном обряде славяне сжигали Масленицу и катали горящие колеса с горы в реку. Это символ сожжения Зимы и встречи Весны ***в день весеннего равноденствия – 24 марта:*** именно в это время день становится длиннее ночи и ***тепло*** побеждает ***холод-стужу***.

Изначально Масленица была широко распространенным праздником – это и понятно: солнце одно на всех! – и отмечалась многими народами: у древних греков был медвежий праздник (комеедица) – комедия, который приходился на 24 марта; в Чехии и Словакии в масленичных играх принимали участие и ряженые медведи; в Македонии на Масленицу "вели медведя на ужин"; у восточных славян это был "праздник пробуждающегося медведя"; белорусы еще в XIX веке справляли этот праздник плясками в медвежьих шкурах или тулупах, вывернутых мехом наружу. Так что Масленица – праздник общеславянский, а не чисто русский, как думают многие.

На Руси во время Масленицы устраивали настоящий "поезд": многочисленные всадники на лошадях, увешанных бубенчиками, держали в руках кнуты, метлы и веники – символы вихрей и молний; пьяный мужик подле чучела Масленицы (деревянная кукла или дерево, украшенное колокольчиками и разноцветными лоскутьями) на одной из повозок (саней), густо усыпанной всякого рода погремушками и бубенчиками – знамения грозовой музыки, держал штоф с водкой и чарку, а рядом с ним непременно ставили еще и бочонок с пивом и короб со съестными припасами (вино и пиво символизировали всеоживляющий дождь). Семь дней Масленицы – семь дней всеобщего веселья, разгула, пиршества перед строгим сорокадневным Великим постом. Каждый день имел свое название и назначение.

В последний день Масленицы, вечером в Прощенное воскресенье, совершался последний акт проводов Зимы. Поселяне выносили из своих дворов на окраину деревни по снопу соломы, собирали хворост, щепки, худые кадки, сверху ставили чучело и поджигали всю кучу после солнечного заката: это называлось сожжением Масленицы. Костер символизировал весеннее солнце, яркие лучи которого растапливали снежные покровы Зимы.

Сценарии праздника в разных регионах отличались друг от друга; инсценировали не только пришествие Весны, но и борьбу Весны с Зимою и поражение Зимы, для чего строили снежные крепости с последующей их защитой и непременным взятием.

Так наши предки отмечали день весеннего равноденствия...

Но тысячу лет назад упрямые язычники вынуждены были перенести празднества на другие сроки под нажимом отцов новой религии – христианства – из-за Великого поста, который не был привязан к конкретной дате. Православная церковь зорко следила за соблюдением поста новообращенными и "постановила" отмечать праздник так, чтобы он приходился за неделю до Великого поста, разрешив пастве есть молочную пищу, и в том числе масло. Отсюда – Масленица. Так что Масленица – название не языческое, а православное, как и время проведения праздника. Только основа его языческая: празднуют Солнце, потому и пекут его горячие пышные изображения – блины, одновременно сжигая идола, который мешал солнцу давать людям тепло.

Смысл этого древнего праздника в наши дни утерян: мало кто знает, что подает не просто блин, а горячее солнце. Никакой мистики, никаких жертвоприношений (кроме блинов), никакого насилия – только радость по поводу наступления Весны, за которой последует Лето, а там и Осень с обильным урожаем. Этому стоило радоваться, это стоило праздновать, ведь это – жизнь, и ничего надуманного тут нет. А с перенесением срока временная логика празднования оказалась потерянной и осталась только гулянка, очередной повод повеселиться...

Да, каждый народ отмечает праздник встречи Весны по своему сценарию, но суть Масленицы везде одна: уничтожив чучело Зимы, открыть дорогу Весне. И ***о ней*** – наша следующая страничка в рубрике "Времена года".

**Дежурная по рубрике Т.АВДОНИНА, доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации.**

## КАНІКУЛЫ – ЧАС ДЛЯ АЗДАРАЎЛЕННЯ

Сёлета, на вялікі жаль, абласное ўпраўленне па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню з-за фінансавых цяжкасцей не арганізавала, як у папярэднія гады, спецыяльныя двухтыднёвыя заезды для студэнтаў і навучэнцаў Гомельшчыны на час зімовых канікулаў у здраўніцы, дамы адпачынку Беларусі. Ва універсітэце давялося шукаць свае, унутраныя рэзервы і магчымасці, каб як мага большая колькасць юнакоў і дзяўчат змагла паўнацэнна адпачыць. Гэта было зроблена з дапамогай калектыву санаторыя-прафілакторыя ГДУ. Тут з сярэдзіны студзеня набіраліся сіл 130 чалавек – з іх 70 перша- і другакурснікаў факультэта фізічнай культуры, якія спачатку прайшлі лыжныя зборы ў ваколіцах г.Гомеля.

30 студэнтаў ГДУ змаглі падлячыцца і адпачыць у беларускіх санаторыях "Прыазёрны", "Сасновы бор", "Крыніца", "Буг". "Лётцы", "Пралеска", "Васільеўка" і інш., атрыманых па сацыяльнаму страхаванню. 20% гэтых пуцёвак выдзяляліся ім бясплатна, астатнія – аплацілі 10% ад іх кошту.

Выкарысталі сваё права на бясплатнае лячэнне і аздараўленне 20 першакурснікаў універсітэта, якім не споўнілася 18 гадоў.

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА НА ЛЬГОТЫ

Сярод студэнтаў ГДУ ёсць тыя, хто мае права на атрыманне льгот па артыкулах №18, 22, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС". Ім неабходна звярнуцца ў прафкам студэнтаў (галоўны корпус, п.1-19) да 15 сакавіка г.г., каб аформіць адпаведныя дакументы для атрымання кампенсацыйных матэрыяльных выплат.

**СПОРТ СПОРТ СПОРТ**

## ...УСІМ РЭКОРДАМ ДАЁМ ІМЁНЫ



У Гомелі прайшоў зімовы адкрыты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па плаванню. У спаборніцтвах прыняло ўдзел больш за 120 мацнейшых плыўцоў з усіх абласцей краіны і г.Мінска. Сярод іх было 8 майстроў спорту міжнароднага класа і 44 – майстры спорту Рэспублікі Беларусь.

Гонар Гомельскай вобласці абаранялі і 4 студэнты факультэта фізічнай культуры ГДУ. Гэта майстры спорту пяцікурснік Уладзімір Катлоўскі і другакурснікі Мікалай Ганчароў, Станіслаў Невяроўскі і кандыдат у майстры спорту Яніна Грамовіч.

У першы дзень спаборніцтваў у мужчынскай эстафеце 4х100 м вольным стылем каманда гамяльчан, за якую выступалі і трое нашых спартсменаў, з адрывам ад другога прызёра амаль на 10 секунд упэўнена заваявала перамогу. А на наступны дзень такога ж поспеху яна дасягнула ў такой жа эстафеце 4х200 м. Пры гэтым быў пераўзыдзены рэкорд Рэспублікі Беларусь нацыянальнай зборнай каманды краіны, які трымаўся з 1998 г.

Самы багаты камплект медалёў дастаўся ў індывідуальных заплывах на долю Мікалая Ганчарова. На другую прыступку п'едэстала гонару ён уздымаўся пасля фінальных заплываў на 100 і 200 м брасам, а на дыстанцыях 200 м брасам і 100 м в/стылем заваяваў бронзавыя ўзнагароды. Уладзімір Катлоўскі быў другім на фінішы ў заплыве на 200 м в/стылем і трэцім у гэтым відзе плавання на 50 і 100 м. Двойчы чацвёртым аказаўся Станіслаў Невяроўскі. Акрамя таго ўсе трое названых плыўцоў сталі бронзавымі прызёрамі ў камбінаванай эстафеце 4х100 м.

Сярод жанчын вызначылася Яніна Грамовіч. Ва ўпартай барацьбе яна здолела заваяваць бронзавую ўзнагароду на дыстанцыі 50 м у плаванні батэрфляем.

Трэба адзначыць, што ў склад судзейскай брыгады, якая абслугоўвала чэмпіянат краіны, былі запрошаны трое студэнтаў факультэта фізічнай культуры: А.Музычэнка, А.Самошын, Ж.Глазунова. Судзейская калегія ацаніла іх работу на "добра".

**І.КАРНІЕНКА, выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.**

## СПАРТАКІЯДА "ЗДАРОЎЕ" ЗАВЕРШАНА. ЯЕ ВЫНІКІ



З 22 студзеня па 2 лютага на спартыўных пляцоўках універсітэта праходзіла спартакіяда "Здароўе" сярод яго выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Перш за ўсё хочацца адзначыць усё ўзрастаючую яе папулярнасць. Сёлета ў спартакіядзе ўдзельнічала 116 чалавек ад 9 факультэтаў. Спаборніцтвы праходзілі па шахматах, настольнаму тэнісу, міні-футболу і валейболу. У агульнакамандным заліку верхні радок турнірнай табліцы заняў факультэт фізічнай культуры. Услед за ім размясціўся геолага-геаграфічны факультэт. Трэцяе і чацвёртае месцы падзялілі матэматычны і біялагічны факультэты. Пятае месца дасталося эканамічнаму, шостае – фізічнаму факультэтам. Наступныя радкі ў турнірнай табліцы занялі адпаведна факультэт замежных моў, факультэт псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, філфак.

На шахматным турніры адпаведна занятых месц прызёрамі сталі эканамічны факультэт, факультэт фізічнай культуры, геолага-геаграфічны факультэт, матфак; па настольнаму тэнісу – факультэт фізічнай культуры, эканамічны і матэматычны факультэты; па валейболу – факультэт фізічнай культуры, геолага-геаграфічны і фізічны факультэты.

Узнагароды пераможцам і прызёрам спартакіяды "Здароўе" былі ўручаны на пашыраным пасяджэнні рэктарата.

Сярод самых актыўных удзельнікаў спартакіяды неабходна назваць дэканаў: матфака – У.В.Арлова, геолага-геаграфічнага факультэта – Г.А.Сербіна; загадчыкаў кафедр М.В.Каняхіна, К.К.Бандарэнку, У.М.Семенчука, Г.Г.Ганчарэнку.

Разам з тым здзіўляе ўпарты няўдзел у спартакіядзе каманд гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў. Тут хочацца ўзгадаць дэвіз Алімпійскіх гульняў: "Галоўнае – не перамога, галоўнае ўдзел". Гэта адносіцца і да спаборніцтваў такога рангу як універсітэцкая спартакіяда "Здароўе".



Запрашаем да будучых стартаў усіх, хто сябруе з фізкультурай, каму па душы здаровы лад жыцця і масавы спорт.

**М.КОРШУК, дырэктар спартклуба ГДУ.**

**В ЗЕРКАЛЕ ФАНТАЗИИ**

## ПРИШЕЛЬЦЫ



Космический корабль сбился с пути и отклонился далеко в сторону от намеченного курса. Экспедиция к "белому карлику" на периферии Вселенной заканчивалась трагически: вышла из строя система жизнеобеспечения.

Капитан собрал всех в салоне и предложил три варианта: направить корабль к ближайшей звезде и врезаться в нее, чтобы не дожидаться мучительной смерти от удушья; повернуть назад и погибнуть по дороге домой, чтобы тела когда-нибудь подобрали свои и доставили на родину; высадиться на ближайшую планету с хоть какими-то формами жизни и основать колонию без всякой надежды вернуться назад или передать домой весточку.

После бурных дебатов приняли третий вариант. Экипаж виртуозно совершил посадку, но ракета упала в зыбучий песок. Пришлось срочно покидать корабль, бросая оборудование и запасы. Атмосфера оказалась насыщенной ядовитыми парами: пока выстроили купола для жилья, погибла треть космонавтов. Потом смертельно ядовитые дожди размыли часть строений и унесли жизни еще трети пришельцев. Остальные кое-как приспособились к новому миру.

Этот мир был ужасен. Вне куполов жить было невозможно. Питательные вещества с трудом удавалось добывать из почвы и различного рода местных организмов. Замкнутый цикл жизни опустил колонистов на уровень примитивных инстинктов. Научные знания либо стали частью инстинкта (строительство куполов по раз и навсегда заданному образцу), либо были просто забыты. Уже третье поколение колонистов не представляло своей далекой прародины, а через сотню поколений пришельцы стали частью нового мира. Такого родного и такого губительного, где жить можно лишь в пределах родного купола и ограниченного ареола освоенной территории.

Однако жизни вне этого мира уже никто не мыслил. Третья планета далекого "белого карлика" стала родиной для пришельцев.

... Когда-то космический корабль совершил здесь вынужденную посадку. Экспедиция к "белому карлику" – Солнцу могла завершиться трагически. А закончилась появлением на Земле термитов.

**К.ЛАПКИН.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
- філасофіі – дацэнта;
- гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін – заг. кафедры;
- англійскай мовы – заг. кафедры;
- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі – асістэнта;
- гісторыі Беларусі – дацэнта.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 93
Падпісана да друку 22.02.2002 г.